Працаўнікі сталовай ня ўжываюць мэтадаў соцспаборніцтва і ўдарніцтва і дрэнна абслугоўваюць сталаўнікоў.

Адміністрацыя сталоўкі павінна ў самы кароткі тэрмін перабудаваць сваю працу, згодна пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ.

Брыгада друку:
Вароўка Т., Круглоў Ю.


Зьнішчыць бруд

Сталоўка пры Магілеўскім Пэдтэхнікуме абслугоўвае 800 чал. студэнтаў але дагэтуль не перабудавала сваёй працы. Студэнты ня маюць магчымасьці своечасова паабедаць; наглядаецца масавае спазьненьне на лекцыі.

У сталоўцы цёмна, брудна. Заўсёды вялікая чарга. Не хапае пасуды для абедаў.

Адміністрацыі тэхнікуму і сталоўкі неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на працу сталоўкі.

Брыгада „ЧЗ“
Нашляк Р.
Рашэня Алесь.



Сталоўка павінна быць чыстай.

Даць добрае кіраўніцтва

Грамадзкае харчаваньне студэнтаў Жыткаўскага Рыбаводнага тэхнікуму пастаўлена на патрэбную вышыню і сталоўка не адпавядае запатрабаваньням студэнтаў.

[illegible] прыходзіцца амаль што [illegible] ў паўднях. Лямпа асьвятляе [illegible] сталы, на другіх сталах [illegible]. У сталоўцы залішне таўканіна, [illegible] імкнуцца да таго стала, дзе стаіць лямпа.

[illegible] гатуюцца дрэнныя, [illegible] забясьпечваецца сталоўка [illegible] і добра.

Сталоўка не перайшла на [illegible] разрахунак, ня зьнішчана абязь[illegible] не прывіліся соцыялістычныя мэтады працы-соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Партыйныя і комсамольскія арганізацыі раёну на гэтыя зьявы мала зьвярталі ўвагі. Абяцаньне райсельпо зьмяніць абслугоўваючы пэрсанал сталоўкі так і засталося абяцаньнем.

Такая пастаноўка грамадзкага харчаваньня [illegible] адбіцца на [illegible] студэнтамі вучэбнага пляну. Райсельпо і партыйная арганізацыя тэхнікуму павінны прыняць усе меры, каб зьнішчыць такое становішча, прымусіўшы загадчыка перабудаваць працу сталовай і [illegible] скарыстаць усе яе магчымасьці.

Мікола Уларны.

[illegible] падбору студэнтаў і стварэньня [illegible] лепшых умоў пра[illegible]

[illegible] НКЗему, Колгасцэнтру і Трактарацэнтру распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па перабудове працы МТС [illegible]

Пленум з усёй катэгорычнасьцю патрабуе [illegible] скарыстаньня мясцовых будаўнічых матар'ялаў [illegible]

Пленум абавязвае НК [illegible], НК Здароўя і Колгасцэнтр [illegible]

[illegible] якія здбыліся ў судносінах клясавых сіл на вёсцы [illegible]

[illegible] у рабоце колгасаў і ініцыятывы [illegible] сапраўднымі бальшавікамі ў барацьбе за кольвасныя і якасныя паказчыкі працы. Кіраўніцтва колгасамі з боку РК КП(б)Б, партыйных ячэек, РВК і сельсаветаў павінна быць [illegible] практычным і канкрэтным. РК КП(б)Б павінны забясьпечыць правільную расстаноўку партыйных і комсамольскіх сіл унутры колгасу. Расстаноўка партыйных сіл павінна быць такой, каб забясьпечыць [illegible] кіраўніцтвам асноўную галіну гаспадаркі.

Сельскія саветы, як правіла, павінны [illegible] у сябе вытворчыя заданьні [illegible] па асобку колгасу і правяраць ступень выкананьня колгасамі [illegible] вытворчых плянаў і сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

XI Соцыялістычная рэконструкцыя сельскае гаспадаркі, якая выкарчоўвае і ліквідуе на сваім шляху кулацтва, [illegible] жорсткай клясавай барацьбы. Кулацтва і яго агентура ўсімі сіламі [illegible] зрываць і шкодзіць правільнай арганізацыі колектыўнай вытворчасьці ўнутры колгасаў. Партарганізацыі павінны [illegible] за дзейнасьцю клясавага ворага [illegible] і стаяць на чале колгасных і бядняцка-серадняцкіх мас, мобілізуючы іх на самую рашучую барацьбу з кулаком і яго абаронцамі. [illegible]

Задача організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў, як цэнтральная на даным этапе [illegible] у барацьбе на два франты: у барацьбе з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і з „лявацкімі“ заскокамі.

Комсамол—шэф усеабучу

СЁНЬНЯ СХОД АКТЫВУ МЕНСКАЙ КОМСАМОЛІ

Якасьць—цэнтральнае зьвяно

Рушым комсамолію на штурм задач, пастаўленых партыяй перад сярэдняй і пачатковай школай!

Сход комсамольскага актыву Менскай організацыі, абгаворыць пытаньне аб стане і далейшых задачах рэалізацыі пастаноў партыі аб школе.

Друкуемыя сёньня матар'ялы сьведчаць аб тым, што комсамолія Менску яшчэ не дабілася патрэбных вынікаў у рэалізацыі гэтых пастаноў. Больш таго, у цэлым шэрагу колектываў гэтыя пастановы не распрацаваны.

Сход актыву, кіруючыся ўказаньнямі партыі, павінен будзе мобілізаваць усю масу комсамоліі на барацьбу за выкананьне задач пастаўленых партыяй перад школай. Галоўная ўвага павінна быць аддадзена якасьці навучаньня, якасьці політэхнізацыі, палепшаньню матар'яльнага становішча настаўніцтва і інш. пытаньням, вырашэньне якіх забясьпечыць новыя перамогі ўсеабучу, новыя перамогі ў падрыхтоўцы пролетарскіх кадраў.

Не ігнараваць настаўніка

„Узмацніць усебаковую практычную дапамогу настаўніку, палепшыць яго матар'яльнае становішча“—такая задача, пастаўленая пастановай партыі аб школе. З дню апублікаваньня гэтай пастановы прайшло больш 2-х з паловай м-цаў. Па гэтаму пытаньню Саўнаркам даў конкрэтныя наказаньні, аб паляпшэньні матар'яльнага становішча настаўніцтва.

МЦРК ня ўзяўся за выкананьне гэтых пастаноў.

На справе абмен наборных кніжак і прымацаваньне да зачыненых размеркавацеляў далёка ня скончаны. У МЦРК не заняліся вылучэньнем цьвёрдага фонду прамтавараў на 4-ты квартал для забясьпячэньня настаўнікаў. У МЦРК адсутнічае дыфэрэнцыяванае забесьпячэньне настаўніцтва.

Пытаньне адчыненьня настаўніцкага зачыненага разьмеркавацеля і сталоўкі ўсё яшчэ ў стадыі вырашэньня.

Комсамольская організацыя яшчэ не праверыла, як выконваюцца дырэктывы партыі і ўраду аб палепшаньні матар'яльнага забесьпячэньня настаўніцтва. Сход комсамольскага актыву Менску павінен прыняць захады па патрэбнай рэалізацыі гэтых пастаноў.

Брыгада „Чырвонай Зьмены“:
Кавалевіч, Граховіч, Сабалеўскі, Кукарэка.

Узброіць студэнцтва наказаньнямі партыі пра школу

Студэнты Менскага гідротэхнікуму жывуць у надзвычайна дрэнных умовах. Ужо прайшоў месяц, як распачаліся заняткі, але студэнты з-за нядбайных адносін з боку Белмэліотрэсту яшчэ і да гэтага часу не забясьпечаны патрэбнымі ўмовамі.

У сваім тэхнікуме ўдарніцтва і соцспаборніцтва ў загоне. Комсамольская ячэйка не разгарнула баявой работы па выкананьню задач, якія вызначаны пастановай ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе. Больш таго, да сёньняшняга дня гэтая пастанова не распрацавана.

Комсамольская ячэйка пакінула па-за ўвагай 6 указаньняў т. Сталіна. Насьценгазэты і тэй няма.

Белмэліотрэст павінен у наступным годзе выпусьціць 200 гідротэхнікаў. Аднак, трэст не забясьпечвае нармальнай работы тэхнікуму. Студэнты ня ведаюць задач, якія на іх ускладзены.

Профіль-жа тэхніка, які скончыў гідратэхнікум, невядомы студэнтам 2-га і 3-га курсу. Навучальныя праграмы не даведзены да кожнага студэнта.

Якасьць навучаньня надзвычайна нізкая.

Гарком павінен неадкладна зацікавіцца становішчам тэхнікуму. Трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці тых, якія зрываюць работу тэхнікума. Наладжваньне работы ў тэхнікуме павінна пайсьці шляхам шырокай распрацоўкі пастаноў партыі аб пачатковай і сярэдняй школе.

С.

Турбіны Белдрэсу ня могуць чакаць

Павольнасьць, бясплянавасьць, адсутнасьць гаспадарчага разрахунку—вінавайцы дрэннай работы транспортнага аддзелу Асінторпу

Аздаравіць партыйнае кіраўніцтва Асінторпу—патрабуюць задачы нашага сёньня

Чатыры месяцы назад адбылася сустрэча пастаўнікоў абсталяваньня для Асінторпу і Белдрэсу і спажыўцоў электраэнэргіі. У складзенай умове на сумесную барацьбу за торф, за энэргетыку ўдзельнікі сустрэчы констатавалі: „Белдрэс імя Сталіна можа даць прамысловасьці Беларусі 10 тысяч кілёват пры 100 проц. рэзэрве. Зараз нагрузка Белдрэсу дасягае максымум 6 тысяч кілёват. Станцыя недагружана, і сродкі, патрачаныя на ўстаноўку абсталяваньня, рацыянальна не скарыстоўваецца“.

Так было раней.

Зараз зьмяніліся ўмовы працы—паўсталі новыя, больш складаныя задачы.

Нагрузка першай Белдрэс павялічылася да 9 тысяч кілёват. Растуць спажыўцы электраэнэргіі. Віцебск, Ворша, Магілеў уключаюць у электрасетку Асінстану свае фабрыкі, заводы, майстэрні. Як ніколі раней, зараз ва ўсю веліч паўстала задача: змагацца за чоткую працу электростанцыі.

Не выключаць току, не амяртвляць правады. За гэта адказваюць комсамолія Аршанскага, Віцебскага, Магілеўскага, Дубровенскага раёнаў і ў першую чаргу—комсамольскія колектывы Белдрэсу і Асінторпу.

Асінстан працуе з вялікімі перабоямі. Часты выпадкі выключэньня току. Нагрузка станцыі зьніжаецца да 2 тыс. кілёват. Выключаны рубільнік б'е па прамысловасьці, зрываючы вытворчыя пляны паасобных прадпрыемстваў.

Пастанова ЦК і СНК ня выканана

Чым-жа гэта вытлумачыць?

Надзвычайна дрэнным забясьпечаньнем Белдрэсу апалам, як у кольвасных так і ў якасных адносінах, невыстарчальнай працай транспортнага аддзелу і торнападачы.

Транспортны аддзел Асінторпу ня выканаў пастанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб давядзеньні сутачнай нагрузкі ў 4 квартале да 400 ваганэтак. Зараз нагружаецца 200-250, а то і меней.

Такое становішча—вынік бязьдзейнасьці Аршанскай комсамоліі, якая не рэалізавала ўмоў сустрэчы не забясьпечыла руховым складам транспортны аддзел Асінторпу.

Ня ведаюць пра загад т. Андрэева

Транспортны аддзел Асінторпу працуе з вялікімі перабоямі.

Гістарычная прамова т. Сталіна і загад т. Андрэева не ляглі ў аснову вытворчай працы партыйных, комсамольскіх і профсаюзных організацый. Рад працаўнікоў пачынаючы ад стрэлачніка і канчаючы дыспэтчарам, ня ведаюць пра існаваньне гэтага загаду. Іх вускакалейпаў, мала абыходзіць праграмны загад т. Андрэева. Загад вялікіх перамог не атрымаў пуцёўку ў цэх, брыгаду, дэпо. А ў выніку транспортны аддзел працуе ўсьляпую, навошчуп, без плянаў, без вытворчых вымернікаў.

Дырэкцыя Асінторпу ня вызначыла кантрольных пунктаў грашовага асыгнаваньня, чым об'ектыўна тармозіць перавод транспортнага аддзелу на гаспадарчы разрахунак, яшчэ больш паглыбляючы бясплянавасьць.

Бясплянавасьць у працы наяўнасьць элемэнтаў „лявацкай“ ураўнілаўкі і абязьлічкі значна зьвізілі якасьць рамонту, павялічылі процант хворых ваганэтак і іх паўторны рамонт. Вось чаму ваганэткі як сьлед не скарыстоўваюцца, а гэта зьніжае перавозачныя магчымасьці.

Орыентацыя на бязьдзейнасьць

Здавалася-б, што партыйная організацыя Асінторпу павінна зьвярнуць максімум увагі на палепшаньне транспорту, на рэалізацыю загаду т. Андрэева. Аднак, мы чулі такія разважаньні:

— „Мы бясьсільны, прышлі ў тупік“—заявіў на бюро партколектыву Асінторпу сакратар т. Белік. Аб т. Беліку „ЧЗ“ ужо ня раз пісала.

Гэта выступленьне лішні раз сьведчыць аб тым, што Белік ня можа далей заставацца ў кіраўніцтве партыйнай організацыі.

Пры бальшавіцкім кіраўніцтве парторганізацыя Асінторпу здолее пераможчы цяжкасьці і палепшыць працу транспортнага аддзелу. Парторганізацыя не бясьсільна і ня стане ў тупік. Трэба толькі абнавіць кіраўніцтва, перебудаваць работу партыйна-комсамольскай організацыі, і на гэтай аснове дабіцца поўнай рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна і загаду наркома т. Андрэева.

За апошнія дні комсамольская організацыя зрабіла першыя крокі ў гэтым напрамку. Зараз ужо няма тэрыторыяльных, пасёлкавых ячэек; на кожным адказна-вытворчым вучастку організавана комсамольская ячэйка. Цэнтр цяжару ўсёй комсамольскай работы перанесен у цэх, у брыгады.

Комсамольская організацыя Асінторпу ўключылася ў сталінскі паход. Кожнаму комсамольцу ўручана комсамольская сталінская пуцёўка. Комсамольскія групы сталі вядучымі ва ўсёй вытворчай працы па ўкараненьню гаспадарчага разрахунку і прэміяльна-прогрэсыўнай зьдзельшчыны, па ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі.

У выкананьні гэтых задач комсамольская організацыя пагрузачных работ аб'явіла сябе ўдарнай. Для дапамогі ў гэтай працы адміністрацыйна - гаспадарчая ячэйка стварыла штурмавую брыгаду.

Захады і павышэньні ролі і расстаноўкі комсамольскіх сіл на пагрузачных работах вызначылі некаторы зрух. Аршанскі РК ЛКСМБ для ўзмацненьня транспорта і перадачы вопыту накіроўвае на Асінторп брыгаду з комсамольцаў чыгуначнікаў Аршанскага вузла. Брыгада павінна асабістым прыкладам дабіцца пераводу параво[illegible]аў на гаспадарчы разрахунак.

Магер, Плашчынскі.

Бэйпін на ваенным стане

ШАНХАЙ. 27, З прычыны распаўсюджаньня чутак, што у Бэйпін прыбылі японскія вайскоўцы, апранутыя у штацкае адзеньне, мясцовы ўрад абвясьціў горад на ваенным стане, забараніў хадзіць па вуліцы пасьля 6 гадзіны ўвечары.

Японія шукае повада

ШАНХАЙ. 27. „Чайна прэс“ паведамляе, што напярэдадні сутычкі між японскімі і кітайскімі войскамі, у Цзян-цзі і выбухла бойка з пераапранутымі ў штацкае адзеньне японцамі пад камандваньнем палкоўніка Дойхара. Японцы прывезьлі з сабою кулямёты. Бойка працягвалася 15 гадзін. Кітайцы панесьлі вялікія страты.

Японскі консул уручыў кітайскаму ураду ўльтыматыўнае патрабаваньне вывесьці войскі. Ва ўльтыматуме ўказваецца, што калі ня будзе выканана паказанае патрабаваньне, а таксама ня спынены ўся ляхія антыяпонскія выступленьні, гэта будзе разглядацца, як выклік па адрасу Японіі. На японскай концэсіі абвешчаны ваенны стан. Замежныя войскі і Цзянцзіне прыведзены ў баявую гатоўнасьць.

***

ТОКІЁ. Японская газэта „Ніці-ніці“ паведамляе, што перад адпраўкай уМанчжурыю тэлеграфных частак Токійская жандармэрыя арыштавала 10 салдат па абвінавачваньню ў сувязі з комуністычнай арганізацыяй, а таксама вядзеньні антыімперыялістычнай пропаганды ў арміі. 2 арыштаваных перададзены прокурору, а астатнія дапытваюцца жандарскімі органамі. Перададзеныя прокурору салдаты Сtowards Суруека і Імс, па словах „Ніці-ніці“—комсамольцы якія працавалі ў арганізацыі яшчэ да паступленьня на вайсковую службу.

Забойствы, захопніцкія пляны японцаў „У духу рэзолюцыі Лігі нацыі“

МУКДЭН. Штаб Хондыё паведамляе, што ў бойцы пад Сінмінам з боку японцаў забіты 4 чалавекі, сярод якіх 1 афіцэр; 9 паранена, з іх 2 сур'ёзна. З кітайскага боку забіта 60 чалавек.

„Моцная Манчжурыя“ магчыма толькі пры супрацоўніцтве з Японіяй“

ТОКІЁ. 27. Старшыня Мукдэнскага ўраду, Юнь-Цзін-Кай (японскі стаўленьнік), у інтэрв'ю з мукдэнскім прадстаўніком агенцтва „Сімбун рэнго“ пацьвердзіў папярэдняе паведамленьне аб намеры ўраду Юань-Цзін-Кая утварыць у Манчжурыі „конституцыйную монархію“. Юань-Цзін-Кай сказаў, што адзіным магчымым кандыдатам на прастол можа быць толькі Пу-І.

Юань-Цзін-Кай лічыць што „моцная Манчжурыя“ магчыма толькі пры умове супрацоўніцтва з Японіяй.

Расстрэл рабочых дэмонстрацый у Чэха-Славакіі

У Фрайвальдаў жандары стралялі ў дэманстрантаў-рабочых

ПРАГА 26. Расстрэл рабочых у Фрайвальдаў (Сілезія) выклікаў у прылеглых раёнах вялізнае абурэньне. Начою ў бліжэйшых гарадох адбыліся дэманстрацыі. Жандамэрыя, атрымаўшы падмацаваньне з 2-х армейскіх рот, ужыла рад сур'ёзных мер, каб напярэдзіць далейшыя выступленьні рабочых. Па атрыманых зьвестках, расстрэл рабочых у Фрайвальдаў быў больш сур'ёзны выпадак, чым гэтым паведамляецца афіцыйна.

Па апошніх зьвестках, уначы ўжо памерла 2 параненых. Сярод забітых 16 гадовая дзяўчына і 14 гадовая работніца. 13 рабочых цяжка паранены, 2-е з іх пры сьмерці. У больніцы было ўстаноўлена, што большасьць параненых атрымалі стрэлы у сьпіну. Гэта сьведчыць аб тым, што жандармэрыя страляла за ўцекачоў.

Комдэпутат парляманту, т. Запатоцкі, выступаў на паседжаньні парляманту з протэстам і ўскрыў сапраўдныя прычыны крывавай расправы над рабочымі ў Фрайвальдаў. Запатоцкі заявіў:—„Пасьля пасьпяховага адпору наступу прадпрыемцаў на галодную зарплату рабочых, у Фрайвальдаў рабочыя масамі ўступілі ў рады чырвоных прафсаюзаў. У гэтыя самы момант соцыял-дэмократычны міністр соцыяльнага забясьпечаньня, Чэх, распарадзіўся аб спыненьні выплаты дапамогі па беспрацоўі членам чырвоных прафсаюзаў.

Калі рабочыя парашылі арганізаваць дэманстрацыю, пратэставаць супроць гэтага рашэньня, урад парашыў на што-бы там ні стала перашкодзіць гэтаму выступленьню рабочых і мабілізаваць усе наяўныя сілы жандараў пад асабістым кіраўніцтвам начальніка жандарскага корпусу, які ўчора спэцыяльна прыбыў у Фрайвальдаў. Як відомы, вы жандаре прымусілі рабочых і служачых паміраць з голаду і патрабуеце пры гэтым, каб быў захаваны спакой і парадак. Мы кажам працоўным: парадак і спакой можа вам даць толькі ўрад“.

Масавыя дэманстрацыі протэсту супроць дзеяньняў азьвярэлай жандармэрыі

ПРАГА 26. У зьвязку з падзеямі ў Фрайвальдаў рабочыя ўсяго раёну абвясьцілі забастоўку протэсту. Усе прадпрыемствы стаяць. На могілках, дзе пахаваны забітыя рабочыя адбылася дэманстрацыя протэсту супроць соцыял-дэмократычнага міністра соцыяльнага забясьпечаньня.—Чэха.

У дэманстрацыі прымала ўдзел значная колькасьць соцыял-дэмократычных рабочых; Як і трэба было чакаць, спэцыяльнае расьследаваньне крывавых падзей у Фрайвальдаў пачалося перш за ўсё з шматгадзіннага вобыску ў памяшканьні акруговага камітэту компартыі і чырвоных прафсаюзаў. У Фрайвальдаў сёньня прыбыла дэлегацыя комдэпутатаў і членаў Чэха-Славацкай дэлегацыі МОПР, каб правесьці расьсьледаваньне крывавых падзей.

Падзеі ў Фрайвальдаў выклікалі хвалю абурэньня па ўсёй краіне. Адусюль атрымоўваюцца паведамленьні аб дэманстрацыях і стачках протэсту.

Сёньня зранку ў Празе дэманстравалі беспрацоўныя. Аб радзе дэманстрацый рабочых паведамляюць з паўночнай Богеміі. Буржуазія і соцыял-фашысцкія газэты імкнуцца адвесьці гнеў рабочых ад сапраўдных вінаватых крывавай расправы і, па—звычцы, заняліся траўляй комуністых.

Забастоўкі протэсту супроць тэрору працягваюцца

ПРАГА, 27. Па ўсёй краіне нарастае хваля рабочага абурэньня з прычыны крывавых падзей у Фрайвальдаў. Рад новых фабрык і заводаў далучыліся да стачкі протэсту і патрабуюць распусьціць урадавую сьледчую камісію, у якой прымае ўдзел таксама і жандарскі генэрал.

Чарговая забарона комуністычнага руху

• БЭРЛІН, 27. Баварскі ўрад забараніў партыйныя ячэйкі і іншыя політычныя арганізацыі ў дзяржаўных установах. Забарона накіравана ў першую чаргу супроць комуністычнага руху.

Перамога рабочых

БЭРЛІН, 27. Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Мітвэйгу (Саксонія), праведзеная пад кіраўніцтвам рэволюцыйнай профопозыцыі супраць 5 процантнага зьніжэньня зарплаты, скончылася поўнаю перамогаю рабочых, прадпрыемцы прымушаны былі адмовіцца ад сваіх патрабаваньняў.

Пасьля закулісных перагавораў С.-Д.—прэзыдэнт прускага ляндтагу

БЭРЛІН, 27. Пасьля доўгіх закулісных перагавораў прэзыдэнтам прускага ляндтагу абраны 250 галасамі з 329 соцыял-дэмократ Літмак; нацыяналісты і соцыял-нацыяналісты ўстрымаліся ад галасаваньня.

На конфэрэнцыі МенАПП



Тав. Бэндэ.

27-га лістапада вячэрняе паседжаньне конфэрэнцыі распачалося прывітальнай прамовай сэкратара Маскоўскай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў т. Фрыдмана.

Тав. Фрыдман падзяліўся во... там работы МАПП і закл... МенАПП да дружнай, сумеснай ... боты ў вырашэньні задач, ста... перад пролетарскай літаратурай ... сталага абмену вопытам работы...

З прывітаньнем ад Асоцы... Пролетарскіх Пісьменьнікаў За... най вобласьці выступіў т. Шаі... які прапанаваў МенАПП заключ... дагавор на соцыялістычнае спа... ніцтва.

Тав. Шаўчэнка ад імя ўсеб... рускай конфэрэнцыі самадзей... мастацтва прад'явіў конфэрэ... соцыялістычны рахунак па ўд... пісьменьнікаў у працы гуртко... лых форм.

Пасьля гэтагаслова для пра... свайго дакладу атрымаў т. Бэ...

На гэтым паседжаньні з в... кай прамовай выступіў сэкра... ВОАПП т. Буачыдзэ, які спы... віўся на задачах перабудовы пр... літаратурных арганізацый на ... ве апошніх паказаньняў ЦО... ты—„Праўды“.

28-га лістапада зранку праця... лі сэкцыі конфэрэнцыі.

Раўненьне на брыгаду т. Хмары

На шклозаводзе імя Домбаля брыгада т. Хмары зьяўляецца лепшай па выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну. Перашоўшы на гаспадарчы разрахунак, брыгада за адну дэкаду выканала прамфінплян на 115 проц. і зэкономіла 22 ...

Па брыгадзе раўняюцца усе ... бочыя заводу. Агульны сход ра... чых пастанавіў прэміяваць ... Хмару.

Крутаўцоў

Напярэдадні ўсебеларускай партнарады па мастацтв...

ТРАМ мацнее, расьце

У першай палове сьнежня адбудзецца першая ўсебеларуская партнарада па пытаньнях мастацтва. Нарада набывае вялізарнае політычнае значэньне ў справе разгортваньня далейшай барацьбы за вялікае мастацтва бальшавізму, за мастацка-нацыянальнае па форме і пролетарскае па зьместу.

Комсамолія павінна прыйсьці да нарады з усебаковым паказам свайго ўдзелу ў барацьбе за пролетарскае мастацтва.

Тэатр, ТРАМ, музыка, самадзейнае мастацтва, выяўленчае мастацтва—усё гэта адказьнейшыя вучасткі барацьбы на фронце культурнай рэволюцыі.

З сёньняшняга нумару „Чырвонай Зьмены“ мы распачынаем падрыхтоўку матар'ялаў да ўсебеларускай партнарады. Сёньня мы паказваем работу Віцебскага ТРАМ'у. У бліжэйшым нумары „Чырвонай Зьмены“ мы дамо слова Менскаму БелТРАМ'у, ЯўТРАМ'у і інш.

Мы заклікаем комсамольцаў, рабочую моладзь падзяліцца на старонках „Чырвонай Зьмены“ сваімі думкамі і прапановамі аб стане і задачах разгортваньня трамаўскага руху БССР, расказаць аб сваім удзеле ў барацьбе за пролетарскае мастацтва.

Рэдакцыя.

Наша эпоха нараджае ўсё новыя і новыя формы мастацкай аг'тацыі, пропаганды і арганізацыі мас. За апошнія гады тэатр рабочае моладзі заваяваў і ўпаўне заслужыў значную популярнасьць і аўтарытэт мастацкага агітпропу комсамолу.

За зусім кароткі час свайго існаваньня Віцебскі тэатр рабочай моладзі дабіўся значных посьпехаў у сваёй рабоце. Аб гэтым красамоўна сьведчыць той аўтарытэт, якім ТРАМ карыстаецца сярод комсамола, рабочай моладзі і рабочых прадпрыемстваў. Дасягнуць гэтага ТРАМ змог толькі дзякуючы таму, што ён перш за ўсё забясьпечаны добрым комсамольскім кіраўніцтвам і тым, што ў самым колектыве ёсьць комсамольская спайка і дысцыпліна, якія так неабходны для плённай работы.

• Калі пачыналіся манэўры Чырвонай арміі, тэатр паслаў сваю ўдарную брыгаду для абслугоўваньня манэўраў. Брыгада паставіла сабе задачу—дапамагчы камандваньню, партыйным і комсамольскім арганізацыям у пасьпяховым правядзеньні манэўраў і наладжваньні сувязі чырвонаармейцаў з працоўнымі. Ударная брыгада ТРАМу разам з групай чырвонаармейцаў зьбірала і афармляла матар'ял. Трамаўцы ў мастацкай форме паказвалі байцам „сьвет і цені“ іх работы і вучобы. За энэргічную работу камандваньне манэўраў неаднакраць выносіла падзяку ўдарнай брыгадзе ТРАМу. Зусім правільна будзе таму адзначыць, што ўдарнікі трамаўцы ў абставінах манэўраў загартаваліся, набылі вялікі вопыт работы, які бязумоўна пайшоў на карысьць у далейшай працы.

ТРАМ паставіў сабе задачай барацьбу за прамфінплян, за шматмільённы комсамол. Ударнікі ТРАМу працавалі на прадпрыемствах, складалі інсцэніроўкі—„Прарыў“, „За шматмільённы“ і інш. Матар'ялы ТРАМу актуальнай, злабадзённы, узяты з жыцьця фабрычных рабочых корпусоў. Продукцыя ТРАМу—у асноўным бадзёрая, выхоўваючая, мобілізуючая. Вынік трамаўскай работы лепш за ўсё бачны у цэхах, на прадпрыемствах: Ячэйкі адстаўшыя ў росьце, падцягваюцца, ілжэўдарнікі пад уплывам ТРАМу і рабочых колектываў перавыхоўваюцца. У гэтым сіла ТРАМу.

У рабоце ТРАМу ёсьць недахопы. Пастаноўкі не заўжды глыбокія і сур'ёзныя. Часта матар'ялы падаюцца не эфэктыўна, зусім слаба. Асабліва гэта датычыцца да пастаноўкі „За шматмільённы“ і г. д. Мастацкае афармленьне можа і павінна быць лепшым. ТРАМ ня зусім сваячасова падхоплівае добрыя і дрэнныя бакі быту комсамолу. Тлумачыць гэта трэба тым, што ў тэатры яшчэ мала моладзі з вытворчасьці, комсамольскага актыву. Апрача таго, з трамаўцамі праводзіцца слабая работа па політычнаму іх выхаваньню, па ўзьняцьцю іх сьветапогляду.

ТРАМ не распаўсюджвыў вопыту сваёй работы на прадпрыемствах гораду. Ён яшчэ з імі мала зьвязаны. Тэатр не аказвае дапамогі фабрычнаму ТРАМу,—які існуе на фабрыцы „Сьцяг індустрыялізацыі“.

Зараз тэатр працуе над вялікай пастаноўкай з жыцьця комсамолу. Менавіта зараз патрэбна ўсямерная яму дапамога з боку ўсіх арганізацый. Аднак, трэба падкрэсьліць што гэтай падтрымкай ТРАМ яшчэ не забясьпечаны і гэта ставіць пад пагрозу яго работу.

ТРАМ ня мае памяшканьня, дзе-б ён мог працаваць. Маленькі, душны пакой пад самай стрэхай БДТ—2-для ТРАМ'у зусім не дастатковы. Хіба організацыя гораду і ў першую чаргу горсавет і гарком ЛКСМБ не маглі аб гэтым паклапаціцца? Тут проста няма патрэбнай зацікаўленасьці, у захвочваньні рабочай моладзі ТРАМам. ТРАМ ня мае каштарысу. Організацыі нічога не зрабілі, каб уключыць тэатр у бюджэт, каб даць яму магчымасьць плённа працаваць. Зараз перад ТРАМам пастаўлена пытаньне аб неабходнасьці разгрузіць 10-15 актывістаў ТРАМу з вытворчай працы з тым, каб ТРАМ меў яшчэ большую магчымасьць разгарнуць сваю работу. ...літасьвет, гарком КСМ павінны неадкладна забясьпечыць ТРАМ срод... Сярод ТРАМаўцаў выхоўваюцца ...тары—рабочыя, гэтыя аўтары павінны быць уцягнуты, заклікаваны у ... пролетарскую літаратуру. Рабочыя ўдарнікі ТРАМу чакаюць дапамогі БелАППаўцаў і гэтая дапамога павінна быць аказана неадкладна.

Перад ТРАМ стаяць вялікія задачы. Паказаць барацьбу нашых дзён, ... біць добрыя і дрэнныя бакі нашай работы, мастацкім паказам змагацца за шматмільённы комсамол, пайсьці ... фабрыку, на завод—вось задачы. ...лікую увагу ТРАМаўскі колектыў ... вінен аддаць змаганьню за дыялектыка-матэрыялістычны творчы мэ... Продукцыя ТРАМу з усёй відавочнасьцю гаворыць за тое, што ТРАМ народжаны бальшавіцкімі тэмпамі, ... тыўна ўдзельнічае ў гэтай барацьбе ... расьце і мацнее. Трэба толькі, ... ТРАМу была аказана патрэбная дапамога. Трэба стварыць ТРАМу належныя ўмовы для работы.

Ударная брыгада „Ч. З“ Д. Усы..., З. Ваўчок, Л. Лісаў, У. Шмідт, Б. М...рэнбаў, В. Азёрны, З. Капыцкі, А. ...рэвіч.

Нам. адказн. рэдактара С. АНІ...

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.